# МЕТАРАМАН: ГІСТОРЫЯ НАВУКОВАГА АСЭНСАВАННЯ І АСНОЎНЫЯ МЕТАЛІТАРАТУРНЫЯ ТЭХНІКІ

**Гуляк**

**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

Выдзяленне металітаратуры ў сучасным літаратурным дыскурсе звязана з паняткам *антырамана* – катэгорыі, уведзенай у 1948 г. Ж. П. Сартрам, якая ахоплівала многія з існаваўшых эксперыментальных раманных формаў. «Насамрэч многія з так званых антыраманаў гэта *металітаратура*» [5, с. 25] – сцвярджае ў эсэ «Філасофія і формы рамана» (1970) амерыканскі крытык і пісьменнік Уільям Гас, упершыню выкарыстоўваючы тэрмін *metafiction*. Адметнасць такіх раманаў У. Гас бачыць у тым, што «літаратурная форма служыць у іх матэрыялам для ўтварэння новых формаў» [5, с. 25].

Варта адзначыць, што мета-тэрміны ў літаратуразнаўстве, шырэй – у культуры (metapolitics, metarhetoric, metatheatre і г.д.), нагадваюць аб 1960-х гг., калі ўвага грамадства і культуры часцей звяртаецца да рэфлексіі, праблем адлюстравання чалавечай свядомасцю навакольнага свету, фарміравання асабістага вопыту. «Таму мета-тэрміны, – піша П. Во, – маюць мэтай даследаванне суадносінаў самой моўнай сістэмы і наваколля, да якога яна звяртаецца. У літаратуры яны патрабуюцца для высвятлення адносінаў паміж светамі ўнутры і звонку літаратуры» [8, с. 3].

Першымі тэкстамі, якія адметнасцямі аповеду прыцягнулі ўвагу даследчыкаў да праблемы «самарэфлексіі ў творы», сталі «Дон Кіхот» М. Сервантэса, «Жыццё і меркаванні Трыстрама Шэндзі» Л. Стэрна, раманы У. Набокава, Дж. Барта і інш.

Дацкая пісьменніца і літаратуразнаўца Інгер Крыстансэн у даследаванні «Значэнне металітаратуры» (1981) трактуе метараман як раман, асноўнай мэтай якога ёсць «*выражэнне аўтарскага ўяўлення досведу праз даследаванне самога працэсу стварэння рамана*» [4, с. 11]. У якасці метадалагічнай асновы І. Крыстансэн выкарыстоўвае канцэпцыю нямецкага

літаратуразнаўцы В. Кайсэра аб трох базавых элементах наратыўнай сітуацыі, такіх як *апавядальнік*, *гісторыя* і *адрасат* або імпліцытны чытач [4, с. 13]. Аналізуючы значэнне металітаратурнага кампанента, І. Крыстансэн звяртае ўвагу на тры пазіцыі: *фігуру апавядальніка і яго канцэпцыю ўласнай ролі ў аповедзе*; *катэгорыю аповеду і яе выражэнне ў рамане*; *важнасць ролі адрасата* [4, с. 14]. На нашу думку, падыход І. Крыстансэн дазваляе ўсебакова апісаць наратыўную сітуацыю ў тэксце з мэтай вызначэння металітаратурнага кампанента.

Роберт Спайрз у манаграфіі «Па-за межамі металітаратурнага метада: напрамкі сучаснага іспанскага рамана» (1984) прапаноўвае тэрмін *self-referential novel* (літаральна раман, які звяртаецца да самога сябе), падкрэсліваючы, што фарміраванне гэтага жанру завяршаецца толькі ў XX ст. Згодна канцэпцыі Р. Спайрза, метад традыцыйнай літаратуры (англ. *fictional mode*) грунтуецца на трыядзе *свету ўмоўнага* альбо *імпліцытнага аўтара*, *свету гісторыі* і *свету чытача* – трох вымярэнняў, аддзеленых непарушнай мяжой. Абапіраючыся на такое ўяўленне, Р. Спайрз вызначае асноўную тэхналогію прымяненення металітаратурнага метаду (англ. *metafictional mode*) ў тэксце: суб’ект аднаго з вымярэнняў (апавядальнік, персанаж або чытач) закранае іншыя, пераходзячы мяжу. Класічныя прыклады такога ўварвання – гэта зварот імпліцытнага аўтара да чытача і аспрэчванне персанажам гісторыі аўтарытэту ўмоўнага аўтара [7, с. 15]. Такую ж прыроду, на наш погляд, мае і аўтарская эстэтычная рэфлексія: апісанне апавядальнікам працэсу стварэння рамана і разважанне над ім.

Манаграфія «Металітаратура, або тэорыя і практыка рамана самасвядомасці» (1984) англійскай даследчыцы постмадэрнісцкай літаратуры Патрысіі Во стала адной з найбольш вядомых тэарэтычных прац па тэме. Па вызначэнні П. Во, металітаратура «свядома сістэматычна звяртае ўвагу на сябе як артэфакт, ставячы пытанне аб суадносінах літаратуры і рэальнасці» [8, с. 2]. На думку даследчыцы, укараненне металітаратурнага зварота тэксту да самога сябе і ўласнай моўнай структуры ёсць адказам на крызіс раманнага

жанру з яго ўсталяванымі формамі, якія страцілі арыгінальнасць. Стратэгіяй выхаду з крызісу для метарамана становіцца *дэфаміліярызацыя* або *адзіўленне* літаратурных традыцый рамана праз іх парадыйнае рэфармаванне [8, с. 65].

Таксама слушным з’яўляецца палажэнне П. Во пра адмаўленне металітаратурай традыцыйнай ролі аўтара як усемагутнай крыніцы аповеду [8, с. 16]. У поўнай адпаведнасці з Бартаўскім тэзісам аб «смерці аўтара», металітаратура аспрэчвае аўтарытэт чалавечай свядомасці, прапануючы фігуру аўтара не менш фікцыянальнага, чым сам твор.

Вартай увагі таксама з’яўляецца ідэя П. Во пра выкарыстанне *рамачных прыёмаў* (англ. *frames*) як сродка рэалізацыі металітаратурных стратэгій. Найбольш пазнавальнымі з такіх прыёмаў з’яўляюцца гісторыя ўнутры гісторыі, чытанне героямі літаратурнай версіі ўласнага жыцця, структура «кітайскай скрыначкі» са шматлікімі наратывамі ўнутры наратыву на розных узроўнях і інш.

К. Барынава сярод самых істотных характарыстык метатэксту называе *рэфлектыўнасць* і *камунікатыўнасць*. Рэфлектыўнасць, абумоўленая літаратурацэнтрычнасцю метатэксту, надае яму рысы полідыскурсіўнасці. Камунікатыўнасць метарамана выражаецца праз фарміраванне своеасаблівага дыялогу чытача з фіктыўным наратарам: працэс чытання тэксту актывізуе ўспрыманне такім чынам, што чытач мімаволі прымае ўдзел у стварэнні тэксту [1, с. 4]. Апошняе адпавядае ідэям іншых даследчыкаў аб тым, што *дыялог з чытачом* альбо *асаблівае значэнне адрасата* ёсць іманентнымі характарыстыкамі металітаратуры.

У манаграфіі «Паэтыка метарамана» (2012) расейская даследчыца Вераніка Зусева-Озкан істотна абмяжоўвае панятак метарамана як жанравай формы, удакладняючы яго вызначэнне. Паводле В. Зусевай-Озкан, метараман – гэта мастацкая структура, якая вар’іруецца паводле суадносінаў двух планаў: падзей у творы і яго стварэння. Слушным з’яўляецца тэзіс В. Зусевай-Озкан аб тым, што прынцыповае адрозненне метарамана ад

блізкіх яму жанраў альбо ад твораў з выкарыстаннем металітаратурных тэхнік палягае ў яго *рэфлексіі над самім сабой як над эстэтычным цэлым* [3, с. 9]. Інакш кажучы, у выпадку метарамана твор цалкам падпарадкоўваецца прынцыпу метарэфлексіі.

Адзначым, што метарэфлексія можа прысутнічаць не толькі ў рамане і не толькі ў эпічным творы, але і ў іншых родах літаратуры (драма, лірыка). Аднак менавіта ў жанры рамана яна ўвасабляецца надзвычай выразна і рэгулярна. Гэта тлумачыцца спецыфічнымі рысамі рамана як жанра, сярод якіх: «хранатоп "незавершанага цяперашняга часу" або рух гісторыі, скіраваны ў невядомасць, "стылістычная трохмернасць", якая прадугледжвае ўзаемадзеянне розных маўленчых манер, асаблівая зона пабудовы вобраза, дзе герой не вычэрпваецца сюжэтам да канца» [2, с. 253]. В. Зусева-Озкан лічыць, што гэтыя якасці вельмі спрыяюць увядзенню метарэфлексіі ў раманны жанр. Герой метарамана яшчэ больш намагаецца знайсці сябе і яшчэ больш фатальна не супадае сам з сабой, чым герой рамана традыцыйнага [3, с. 13]. Гэта дазваляе вылучыць яшчэ адну ўласцівасць метарамана – *характэрны тып героя*. Г. Бутырчык вызначае яго як самотнага скептыка, які, адмежаваўшыся ад грамадства, намагаецца адшукаць сэнс свайго існавання.

Такім чынам, цалкам мэтазгодным з'яўляецца выдзяленне метарамана як асобнага варыянта жанру. Прынцыповае адрозненне метарамана ад блізкіх яму формаў з прыкметамі звароту да саміх сябе палягае ў яго *рэфлексіі над самім сабой як над эстэтычным цэлым*.

На нашу думку, найбольш пашыранымі метараманнымі тэхнікамі з'яўляюцца: *пабудова наратыўнай сітуацыі парушэння мяжы паміж светамі аўтара, гісторыі і чытача*; *адзіўленне і парадыйнае пераасэнсаванне папярэдняй літаратурнай традыцыі*; *увядзенне фікцыянальнага аўтара*; *выкарыстанне рамачных прыёмаў*; *увядзенне характэрнага тыпу героя*.

**Літаратура**

1. Баринова, Е.Е. Метатекст в постмодернистском литературном нарративе (А. Битов, С. Довлатов, Е. Попов, Н. Байтов). Автореферат дисс ... кандидата филологических наук: 10.01.08 / Баринова Екатерина Евгеньевна; [Место защиты: Твер. гос. ун-т]. – Тверь, 2008. – 24 с.
2. Бахтин, М.М. Эпос и роман / Бахтин М.М. // Вопросы литературы и эстетики, 1975 – 470 с.
3. Зусева-Озкан, В.Б. Поэтика метаромана: «Дар» В. Набокова и «Фальшивомонетчики» А. Жида в контексте литературной традиции / Озкан Вероника Борисовна. – Москва: РГГУ, 2012. – 232 ст.
4. Christensen, Inger. The Meaning of Metafiction / Inger Christensen. – Bergen: Universitets Forlaget, 1983. – p.
5. Gass, William H. Philosophy and the Form of Fiction [Электронны рэсурс] / William H. Gass. – Рэжым доступу: https://ru.scribd.com/doc/294268590/3-William-H-Gass-Philosophy-and-the-Form-of-Fiction-PDF. – Дата доступу: 06.05.2017.
6. Hutcheon, Linda. Narcissistic Narrative: The Metafictional Paradox / Linda Hutcheon. – Waterloo, Ontario: Wilfrid Laurier University Press, 1980. – 182 p.
7. Spires, Robert C. Beyond the Metafictional Mode: Directions in the Modern Spanish Novel / Robert C. Spires. – Lexington, Kentucky: University Press of Kentucky, 1984. – 152 p.
8. Waugh, Patricia. Metafiction The Theory and Practice of Self-Conscious Fiction / Patricia Waugh. – London, New York: Routledge, 1984. – 187 p.